**Акулаў П.**

# ЗАЛАТАЯ ЗОРКА ВОІНА

БАЯВЫ шлях Кірылы Пракопавіча Чарнова пачаўся ў Мінску. Тут ён скончыў школу малодшых камандзіраў, вывучаў азы салдацкай навукі. Але ў той час ён яшчэ не думаў, што назаўсёды звяжа сваё жыццё з арміяй. Ён збіраўся пасля службы вярнуцца ў сваю вёску Амеленская Слабодка, што на Магілёўшчыне.

Але пачалася вайна. Кірыла Чарноў стаў начальнікам разведатрада асобага прызначэння.

Неяк выклікаў яго генерал і паставіў задачу: да ранку абавязкова здабыць "языка".

– Ёсць здабыць "языка"! – адказаў Чарноў.

У тую ж ноч разведатрад Чарнова рушыў у шлях. Прыглушана шумелі маторы, за машынамі заставаўся кіламетр за кіламетрам. Капітан спыніў атрад. На світанні быў выяўлен праціўнік. Разведатрад Чарнова замаскіраваўся ў лесе, прытаіўся, сочачы за кожным рухам гітлераўцаў. Налічылі дзевяць бронемашын, каля ста матацыклістаў і столькі ж веласіпедыстаў. Мяркуючы па ўсяму, гэта быў фашысцкі разведатрад.

– Ну што ж, на лаўца і звер бяжыць, – сказаў Кірыла Пракопавіч, абдумваючы план бою. Ён вырашыў прапусціць варожую разведку наперад і ўдарыць з фланга і тылу. Танкі Чарнова адкрылі агонь па бронемашынах гітлераўцаў. Яны запалалі, на дарозе ўтварыўся затор. Тым часам нашы разведчыкі агнём з аўтаматаў касілі варожых матацыклістаў і веласіпедыстаў. Бой быў кароткі, жорсткі. Фашысцкі развед-атрад быў знішчаны, захоплена шэсць палонных. у тым ліку начальнік разведкі, каштоўныя дакументы.

Генерал Часноў сустрэў капітана Чарнова радасна.

– Ну, дзякуй табе, дзякуй...

За гэту аперацыю Кірыла Пракопавіч быў узнагароажан ордэнам Чырвонага Сцяга.

Вясной 1942 года Кірылу Пракопавіча выклікалі ў Маскву і назначылі камандзірам новага артылерыйскага палка. Фарміраванне было хутка закончана, і ён з палком адразу ж адправіўся пад Сталінград У саставе 64-й і 21-й армій удзельнічаў у знішчэінні акружанай групоўкі нямецка-фашысцкіх войск. Артылерысты Чарнова наносілі трапныя, знішчальныя ўдары па варожых збудаваннях і садзейнічалі поспеху нашай пяхоты.

У баях на Арлоўска-Курскай дузе Чарноў камандаваў 29-й артылерыйскай брыгадай. На другі дзень пасля пачатку бітвы, 6 ліпеня 1943 года, яго выклікаў генерал Ватуцін і паставіў задачу: заняць процітанкавы рубеж і разам з танкавым палком не дапусціць прарыву

на гэтым участку варожых танкаў. Што і гаварыць, задача была нялёгкая. Гітлераўцы рабілі адчайныя намаганні прарвацца, але артылерысты і танкісты непахісна стаялі на сваіх рубяжах. Фашысты страцілі восемдзесят танкаў і бронемашын і не змаглі дабіцца поспеху.

У канцы верасня 1943 года артылерыйская брыгада ў саставе стралковага корпуса выйшла да Дняпра, захапіла плацдарам на правым беразе. Гітлераўцы засыпалі брыгаду снарадамі, кідалі ў бой танкі і пяхоту. Нашы артылерысты разам з пяхотнымі падраздзяленнямі адбівалі ўсе варожыя атакі. Маршал Савецкага Саюза Г. К. Жукаў, які назіраў за гэтым боем з каманднага пункта, даў высокую ацэнку дзеянням артылерыйскай брыгады Чарнова.

– Заслугоўвае звання гвардзейскай, – сказаў Г. К. Жукаў камандуючаму арміяй.

"Плацдарм па правым беразе Дняпра быў утрыман дзякуючы стойкасці і мужнасці артылерыйскай брыгады", – пісаў у рэляцыі камандуючы артылерыяй 47-й арміі.

Неўзабаае 29-я брыгада была пераўтворана ў 9-ю гвардзейскую і ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга. Камандзіру брыгады маёру Кірылу Пракопавічу Чарнову было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза і званне падпалкоўніка. Залатую Зорку Героя атрымалі і некаторыя іншыя артылерысты брыгады, якія найбольш вызначыліся. Гэта была вялікая ўрачыстасць для ўсяго асабовага саставу злучэння.

У кастрычніку 1943 года гвардзейцы-артылерысты зрабілі вялікі марш і сканцэнтраваліся на поўнач ад Кіева. Пачыналіся баі за вызваленне сталіцы Украіны. У магутных артылерыйскіх залпах, якія разбуралі фашысцкую абарону, быў важкі ўклад і воінаў 9-й гвардзейскай артылерыйскай брыгады. Як заўсёды, Кірыла Пракопавіч паспяваў усюды: бываў на агнявых пазіцыях батарэй, сустракаўся з камандзірамі палкоў і аддаваў кароткія, дакладныя каманды з НП Ён добра ведаў цвёрды, упэўнены "почырк" падначаленых і ганарыўся імі. У баях за вызваленне Кіева артбрыгада падпалкоўніка Чарнова яшчэ раз паказала высокае майстэрства і баявую сталасць. Яна атрымала ганаровую назву Кіеўскай і была ўзнагароджана ордэнам Леніна.

У гэтых баях разрывам снарада падпалкоўнік Чарноў быў кантужаны. Яго адвезлі ў шпіталь Са слязамі на вачах расставаўся камандзір брыгады з баявымі сябрамі.

Пасля лячэння Кірылу Пракопавіча ўжо ў другі раз выклікалі ў Маскву і назначылі камандзірам 170-й артылерыйскай брыгады, якая толькі што сфарміравалася і неўзабаве была перакінута пад Будапешт, дзе баі пад канец 1944 года набылі жорсткі і ўпарты характар. 20 снежня 1944 года войскі 2-га і 3-га Украінскіх франтоў перайшлі ў наступленне на поўнач ад Будапешта, прарвалі абарону праціўніка і сустрэліся ў раёне Эстэргом, завяршыўшы акружэнне 188-тысячнай групоўкі нямецка-фашысцкіх войск.

Артылерыйская брыгада падпалкоўніка Кірылы Чарнова вырашала ў гэтых баях многія баявыя задачы. Яна граміла ўмацаванні, ворага,

падаўляла яго артылерыю. Не раз артылерысты знаходзіліся ў крытычным становішчы, але выходзілі пераможцамі. Аднойчы іх агнявыя пазіцыі атакавалі фашысцкія танкі, за імі густымі ланцугамі ішла варожая пяхота. Артылерысты не пахіснуліся. Падпусціўшы галаўныя машыны на блізкую адлегласць, батарэі адкрылі агонь прамой наводкай. Запалалі "пантэры" і "Тыгры". Варожая пяхота была адсечана ад танкаў і адкінута магутнымі залпамі гармат.

Будапешт быў вызвален! У падраздзяленнях чыталі загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Кірылл Пракопавіч віншаваў баявых сяброў з поспехам, з высокай ацэнкай іх ратнага подзвігу.

Наперадзе была Вена, упартыя баі.

9 мая 1945 года асабовы састаў артылерыйскай брыгады сабраўся на мітынг.

– Перамога! – радасна крычалі салдаты.

Скончылася вайна. Вярталіся дамоў салдаты.

У 1946 годзе Чарноў паехаў у Маскву ў артылерыйскую акадэмію.

Пасля сканчэння акадэміі палкоўнік Чарноў быў на камандных пасадах у Адэскай ваеннай акрузе, затым у групе савецкіх войск у Германіі. У 1953 годзе Кірылу Пракопавічу было прысвоена званне генерал-маёра артылерыі.

Генерал Чарноў аб'ездзіў усю краіну, але ніколі не забывае пра родную Беларусь. На Магілёўшчыне жывуць два яго браты і сястра. І цяпер, знаходзячыся ў запасе, ён часта завітвае ў родныя мясціны – то з сям'ёй, а то і адзін. У вёсцы Амеленская Слабодка Кірыла Пракопавіч заўсёды жаданы госць. Аднавяскоўцы ганарацца сваім земляком, Героем Савецкага Саюза.

**Акулаў, П. Залатая зорка воіна / П. Акулаў // Звязда. — 1971. — 3 лютага. — С. 4.**